# 4 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ САВЕТ САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі Універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 3 (1229) 25 студзеня 1979 г. Цана 2 кап.


## *Забяспечана сацыялізмам*

**Развіццё Савецкай дзяржавы і сацыялістычнай дэмакратыі мы разглядаем перш за ўсё як магутны сродак для дасягнення нашай галоўнай мэты — пабудовы камунізму.**

**Л. І. БРЭЖНЕЎ.**

«Задачы камуністаў юрыдычнага факультэта ў выбарнай кампаніі ў Вярхоўны Савет СССР» — з такім парадкам дня прайшоў сход камуністаў юрыдычнага факультэта БДУ.

З дакладам на сходзе выступіў дацэнт Я. М. Тагуноў. Ён падкрэсліў, што ў гэтым годзе выбары ўпершыню будуць праходзіць у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй СССР і Законам аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Задача камуністаў і ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў юрфака — усяляк садзейнічаць таму, каб выбарная кампанія прайшла на высокім палітычным узроўні. Выступаючы заклікаў камуністаў прыняць актыўны ўдзел у перадвыбарнай кампаніі.

У спрэчках па дакладу выступілі дацэнты В. А. Дарогін, А. Т. Лейзераў і іншыя таварышы.

Па разгледжанаму пытанню сход прыняў пастанову.

## Запрашае агітпункт

Агітпункты сталі ў дні перадвыбарнай кампаніі цэнтрамі партыйнай і палітычнай работы. Тут праходзяць вечары пытанняў і адказаў, лекцыі, кансультацыі. На агітпунктах выбаршчыкі сустракаюцца з дэпутатамі, ветэранамі партыі і камсамола, войн і працы. Тысячы камуністаў і камсамольцаў уліліся ў армію агітатараў. Ім даверана адказная работа: данесці да кожнага сэнс сапраўднага дэмакратызму нашай выбарнай сістэмы, растлумачыць сутнасць новага Закона аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР.

Вялікая мэтанакіраваная работа ў гэтым напрамку вядзецца ў агітпункце, які знаходзіцца ў НДІ ПФП. 18 чалавек прыцягнуты да работы ў агітпункце. З іх — 15 супрацоўнікаў інстытута і 3 студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі.

На агітпункце ўжо адбыліся гутаркі: «Аб міжнародным становішчы» (правёў І. А. Бейдзін), «Савецкая выбарная сістэма — самая дэмакратычная ў свеце» (правёў член партбюро інстытута М. І. Дзямчук). Гутарку па матэрыялах лістападаўскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС правёў А. Р. Кучынскі.

**Л. АНДРЭЕВА.**



Сесія—час праверкі атрыманых ведаў.

Фота **М. Дубовіка.**

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

**АГЧ БДУ імя У. І. Леніна паведамляе, што крытычная заметка Т. Вяцкай «Хто за гэта ў адказе!», змешчаная ў № 1 газеты «Беларускі універсітэт» за 1979 год, абмеркавана на сходзе вадзіцеляў гаража.**

**Нявыезд аўтобусаў у прафілакторый да 7.50 меў месца ў дні моцных марозаў з-за адсутнасці цёплых боксаў для стаянкі аўтобусаў. Астатнія рэйсы здзяйсняліся па графіку прафкома.**

**У сувязі з сесіяй студэнты спынілі паездкі ў 7.50 і 19.20. Гэта пацвярджаюць праверкі, зробленыя адміністрацыяй АГЧ і прафкомам 11, 12 і 13 студзеня г. г., калі на рэйсы ў 7.50 з прафілакторыя і ў 19.20 з універсітэта не было ніводнага студэнта. Таму па ўзгадненню з прафкомам на перыяд сесіі з 15 студзеня г. г. рэйсы будуць у 12.00 і 16.00 з БДУ, 13.05 і 17.05 з прафілакторыя.**

**З пачаткам заняткаў рэйсы будуць праходзіць адпаведна з мінулым графікам прафкома.**

**М. ЛЯПІЛА,**
**прарэктар БДУ па АГЧ.**

## АГЛЯД ЗАКОНЧЫЎСЯ — ПРАБЛЕМЫ ЗАСТАЛІСЯ

Плакаты, дыяграмы, фотавітрыны, выстаўкі маюць вялікую сілу ўздзеяння і шырока выкарыстоўваюцца як сродак выхавання. Накіраванасць гэтых і іншых сродкаў нагляднай агітацыі дасягае мэты, калі яны выкананы з густам, гарманіруюць з памяшканнем і асяроддзем.

Камісія парткома распрацавала крытэрыі ацэнкі нагляднай агітацыі, згодна з якімі быў праведзен агляд-конкурс факультэтаў БДУ.

Цяпер, калі закончыліся спрэчкі камісіі, месцы размеркаваны і зацверджаны, можна паразважаць над тым, чаму той ці іншы факультэт не змог дабіцца ў афармленні нагляднай агітацыі высокіх вынікаў, што яшчэ неабходна зрабіць, на чым сканцэнтраваць увагу.

**Перамаглі фізікі.** На факультэце на высокім мастацкім узроўні адлюстраваны важнейшыя падзеі жыцця краіны, рэспублікі, факультэта і кафедр. Ёсць перспектыўны план работы па нагляднай агітацыі, добра аформлены стэнды кафедр, дошка выдатнікаў, дошка пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, спартыўны стэнд і г. д. На жаль, не абышлося без недахопаў: ніяк не адлюстравана работа па прапагандзе палітычных і навуковых ведаў.

**Другое месца прысуджана біяфаку.** Наглядная агітацыя гэтага факультэта пакідае вельмі добрае ўражанне ў цэлым. Стэнды кафедр цікавыя і змястоўныя. Афарміцелі падумалі і над тым, як апаратыўна замяніць той ці іншы элемент нагляднай агітацыі: зрабіць гэта можна хутка і без урону для астатняга матэрыялу. Наглядна адлюстраван на факультэце ход сацыялістычнага спаборніцтва.

На факультэце радыёфізікі і электронікі, які заняў **трэцяе месца,** наглядная агітацыя таксама адпавядае асноўным патрабаванням. Добра адлюстраваны важнейшыя падзеі апошняга часу, з густам аформлены стэнды кафедр, пакой камітэта камсамола. Але прапаганда дасягненняў лепшых студэнтаў вядзецца недастаткова, няма дошкі выдатнікаў.

Філалагічны факультэт аформлен з вялікім густам, па адзінаму плану, рэалізацыя якога блізкая да завяршэння. Арыгінальна вырашана афармленне стэндаў аб Мінску, аб Беларусі і інш. У выніку — пачэснае **чацвёртае месца.**

**На пятым месцы** — хімічны факультэт, на якім выкананы вялікія падрыхтоўчыя работы для афармлення факультэта ў будучым. Аднак цяпер наглядная агітацыя аформлена без адзінага плана. Сустракаюцца цікавыя і змястоўныя рашэнні, але ёсць і скампанаваныя ў спешцы або ўстарэўшыя стэнды. На некаторых кафедрах яны малазмястоўныя.

Геаграфічны факультэт і журфак падзялілі **шостае і сёмае месцы.** Нягледзячы на значны аб'ём выкананых работ, вялікую колькасць элементаў нагляднай агітацыі і нядрэнны іх змест, афармленне геафака нельга лічыць здавальняючым. Гэта вынік адсутнасці адзінага плана нагляднай агітацыі.

Журналісты нядаўна пераехалі ў новае памяшканне. Наглядная агітацыя факультэта афармляецца па плану, які блізкі да завяршэння. Разгорнуты цікавыя фотавыстаўкі студэнтаў, на якіх ёсць многа работ, атрымаўшых прэміі на конкурсах у СССР і за мяжой. На жаль, тут мала інфармацыі як аб рабоце кафедр, так і аб жыцці факультэта і яго выпускнікох.

**На восьмым месцы** — гістарычны факультэт. Высокі мастацкі ўзровень афармлення музея БДУ і спецкабінетаў не заўсёды знаходзіцца ў адпаведнасці з афармленнем факультэта ў цэлым. Адзінага плана афармлення няма. Жыццё факультэта, яго традыцыі, дасягненні, работа кафедр паказаны слаба. Многія добрыя пачынанні не даведзены да канца (спіс выпускнікоў-выдатнікаў, напрыклад, заканчваецца 1968 годам).

Механіка-матэматычны факультэт заняў **дзевятае месца.** Афармленне яго фрагментарнае, бяспланавае. Добрыя задумы (спартыўны стэнд, галерэя вядомых матэматыкаў і інш.) не атрымалі адпаведнага афармлення. Не адлюстравана работа кафедр.

Нягледзячы на тое, што на юрыдычным факультэце добра прапагандуюцца матэрыялы XXV з'езда КПСС ён на **дзесятым месцы.** У юрыстаў наогул няма прапаганды дасягненняў факультэта. Вялікая колькасць элементаў нагляднай агітацыі, сярод якіх шмат стандартных плакатаў, вывешана бессістэмна. На іх фоне цяжка адшукаць асобныя цікавыя стэнды (напрыклад, прысвечаныя пытанням патрыятычнага выхавання).

На апошнім, **адзінаццатым месцы** — факультэт прыкладной матэматыкі, кіраўніцтва якога лічыць, што ў існуючых умовах работы факультэта добрай нагляднай агітацыі не можа быць. І толькі спартыўны стэнд і стэнд кафедры агульнага праграміравання даказваюць, што гэта не так.

Такім чынам можна зрабіць вывад, што высокі ўзровень афармлення нагляднай агітацыі можа быць забяспечан пры сур'ёзным падыходзе кіраўніцтва факультэтаў і іх грамадскіх арганізацый да гэтай важнай справы. Планы работы па нагляднай агітацыі факультэтаў павінны быць складзены ў адпаведнасці з планам афармлення універсітэта ў цэлым. Актыўны ўдзел у гэтым неабходна прыняць выкладчыкам грамадскіх дысцыплін. Трэба прыцягнуць да афармлення прафесіянальных мастакоў-афарміцеляў, шукаць новыя формы выражэння ў нагляднай агітацыі гераічных падзей у жыцці народа.

Агляд закончыўся, але праблемы афармлення нагляднай агітацыі засталіся. І вырашыць іх можна толькі агульнай зацікаўленасцю, агульнымі намаганнямі.

**С. ШУШКЕВІЧ,**
**прафесар, загадчык кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, старшыня камісіі па нагляднай агітацыі і насценнаму друку.**



Экзамен па марфалогіі раслін прымае ў студэнтаў-біёлагаў дацэнт **Т. А. Сауткіна.** Фота **М. Дубовіка.**

**Нашы выдатнікі**

## КОШТ ГЛЫБОКІХ ВЕДАЎ

Неяк непрыкметна падышла і апошняя сесія для студэнта-завочніка Анатоля Конанава. Здаецца, зусім нядаўна ён толькі марыў аб паступленні на аддзяленне філасофіі. А вось ужо і фініш.

Анатоль Мікітавіч скончыў ваеннае вучылішча, з 1969 года — партыйны работнік. Добра ведае кошт глыбокім ведам. А яны партыйнаму работніку асабліва неабходны.

У першыя гады студэнцтва было вельмі цяжка спалучаць працу з вучобай. Кожны дзень ён адводзіў на самастойныя заняткі па чатыры гадзіны. Дасканала вывучаў кожны прадмет.

Анатоль Конанаў расказвае:

— На першых курсах я займаўся добра, а вось апошнія сесіі вырашыў здаць толькі на выдатна.

Апошняя сесія. Яна надзвычай складаная. Да яе Конанаў рыхтаваўся асабліва сур'ёзна, бо павінен падвесці вынік усяму пройдзенаму.

Патрэбна адзначыць і тое, што Анатоль Конанаў у час сесіі дапамагае ў вучобе сваім сябрам-аднакурснікам Валерыю Собалю, Канстанціну Лыткіну, Яўгену Смірнову. Цяпер яны таксама здаюць сесіі на добра і выдатна. Сябры вельмі ўдзячны таварышу за дапамогу, адзываюцца аб ім як аб выдатным чалавеку.

Вучоба ва універсітэце дала Конанаву неабходныя веды, але на маё пытанне аб планах на будучае Анатоль Мікітавіч адказаў:

— У навуцы я не бачу пачатку і не бачу канца. І ў мяне ёсць яшчэ адна мара — паступіць і таксама выдатна скончыць ваенна-палітычную акадэмію.

**А. БАРАН,**
**навучэнец ПА.**

## *Размова перад залікам*

Праходзячая сесія — пара праверкі ведаў і для завочнікаў. Каб даведацца аб іх справах і настроі напярэдадні экзаменаў, мы звярнуліся да студэнтаў-завочнікаў III курса юрыдычнага факультэта. Знаёмцеся: Мікалай Крачко, намеснік начальніка Ленінскага РАУС г. Брэста. Яму слова:

— Наша другая група, дзе займаецца 38 чалавек,—адна з лепшых на курсе. Калі звярнуцца да красамоўства лічбаў, то наша паспяховасць роўна 97 працэнтам. Выдатнікі вучобы У. Таўкач, І. Багачоў, В. Кудраўцаў, І. Амялькевіч і іншыя заўсёды дапамагаюць таварышам, якім патрэбна кансультацыя па тых ці іншых пытаннях.

Калектыў групы маналітны, згуртаваны. За тры гады засваення вучэбнай праграмы хлопцы і дзяўчаты змаглі пасябраваць па-сапраўднаму, хаця геаграфія нашага пражывання даволі шырокая. Мае аднакурснікі прыязджаюць з Віцебска і Кіева, Мурманска і і Ноўгарада. У асноўным гэта людзі, якія сваё жыццё прысвяцілі нялёгкай і небяспечнай службе ў міліцыі.

...Атмасфера ў групе юрыстаў перад залікам па фінансаваму праву панавала баявая. Настрой, можна сказаць, быў на пяцёрку. Часу да прыходу выкладчыка заставалася вельмі мала, і мы паспяшаліся развітацца з правазнаўцамі, жадаючы ім «ні пуху...»

**Н. БАЛДЫШЭЎСКАЯ,**
**Г. ДЗІМІТРАЎ,**
**навучэнцы ПА.**



Кароткія перапынкі паміж лекцыямі, але і за гэты час студэнты-завочнікі паспяваюць пракансультавацца па незразумеламу пытанню.

**На здымку:** шасцікурснікі геафака Аляксандр **Сапліца,** Галіна **Комлева,** Сяргей **Сіманюкоў.** Фота **М. Дубовіка.**

# УВАГА: ЗАДАЧЫ

НА ЗАВОЧНЫМ факультэце — адказная пара: зімовая экзаменацыйная сесія. У адрозненне ад стацыянара сесія завочнікаў — гэта не толькі непасрэдная падрыхтоўка і здача экзаменаў і залікаў. Гэта і лекцыі, і практычныя заняткі, і семінары, і лабараторныя распрацоўкі, і абарона курсавых работ. Сесія — гэта магчымасць праверыць свае веды, гэта экзамен на ўменне спалучаць вучобу з работай.

Як вядома, падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці для шэрагу галін народнай гаспадаркі нашай рэспублікі з'яўляецца адной з форм павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню шырокіх працоўных мас. І не выпадкова пытаннем завочнай адукацыі ў нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага. Гэты клопат партыі і ўрада абавязвае нас на далейшую мабілізацыю нашых намаганняў, якія садзейнічаюць паляпшэнню якасці падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў.

На завочным факультэце навучаецца больш чатырох тысяч студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю па васьмі спецыяльнасцях. Большасць з іх — гэта людзі добрасумленныя, якія умела сумяшчаюць вучобу ва універсітэце з работай па выбранай спецыяльнасці. У ліку такіх можна назваць выдатнікаў вучобы і тых, хто займаецца на добра і выдатна. Гэта студэнты аддзялення філасофіі Н. С. Сямёнаў, А. Н. Конанаў, Р. К. Сідорчык; аддзялення геаграфіі А. А. Аўчарук; аддзялення біялогіі Г. І. Лушчык і В. Н. Фаміна; аддзялення журналістыкі З. Г. Дзарахохаў, М. Д. Кароль; аддзялення беларускай мовы і літаратуры Л. Н. Мацюк і М. Н. Кулеш, Н. Ф. Панко; аддзялення рускай мовы і літаратуры В. В. Шулянкоў; аддзялення гісторыі М. Г. Гразнова, Н. В. Платонава; аддзялення правазнаўства В. В. Вронскі, А. І. Радзюк і А. М. Шупта і многія іншыя.

Нельга не адзначыць тых студэнтаў, якія спалучаюць сумленныя адносіны да вучобы з абавязкамі стараст груп і курсаў. Гэта А. І. Тучынскі (аддз. геаграфіі), В. Н. Пракоф'еў, В. Г. Хлопаў і Г. Н. Ігнатовіч (аддз. філасофіі), Я. В. Мазанік (аддз. бел. мовы і літаратуры), М. Б. Маскалёнак (аддз. правазнаўства), Г. С. Мініна (аддз. гісторыі), А. С. Пірагін (аддз. правазнаўства), Т. П. Чарнуха і А. П. Міхневіч (аддз. біялогіі) і іншыя.

Толькі на выдатна здалі зімнюю экзаменацыйную сесію мінулага навучальнага года 225 чалавек і 1098 — на добра і выдатна, летнюю экзаменацыйную сесію здалі на добра і выдатна 521 чалавек.

Работнікі дэканата завочнага факультэта рады павіншаваць калектыў студэнтаў і выкладчыкаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры, які заняў першае месца па паспяховасці на завочным факультэце ў мінулым навучальным годзе.

Наогул вынікі паспяховасці на завочным факультэце сведчаць аб тым, што большая частка студэнтаў ставіцца да вучобы з высокай адказнасцю.

Аднак нас не можа не хваляваць той факт, што па-ранейшаму значным застаецца колькасць тых, хто паспявае толькі на здавальняюча. Гэта ў першую чаргу студэнты, якія не жадаюць сістэматычна працаваць у міжсесійны перыяд, якія нядобрасумленна ставяцца да выканання кантрольных і курсавых работ, несамастойна іх выконваюць, груба парушаюць вучэбную дысцыпліну. Гэтыя студэнты, як правіла, і паспяваюць слаба, маюць з сесіі ў сесію акадэмічную запазычанасць. Так, напрыклад, студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры М. С. Дудак выслала кантрольную работу па палітычнай эканоміі, якую выканаў іншы студэнт, ужо правераную і адрэцэнзіраваную выкладчыкам, памяняўшы пры гэтым толькі вокладку сшытка.

Прыходзіцца да гэтага часу мець справу з такімі студэнтамі, якія з году ў год займаюцца дрэнна, маюць у сесію па некалькі нездавальняючых адзнак. Да ліку такіх адносяцца Т. М. Квяткевіч, Г. Н. Мяжэвіч (II курс аддз. гісторыі), студэнты таго ж аддзялення Я. І. Асмантовіч (III курс), К. С. Нікольская і В. В. Верабей (IV); Л. А. Ахрэм (IV курс аддз. рускай мовы і літаратуры), таго

## СПРАВА ПАЧЭСНАЯ

Пры камітэце камсамола і партбюро гістфака паспяхова дзейнічаюць падраздзяленні ФГП. Аб адным з іх—школе ваенна-патрыятычнага выхавання, якая створана на гістфаку, расказвае дацэнт кафедры гісторыі БССР І. В. Марчанка.

**— Іван Васільевіч, што, па-Вашаму, галоўнае ў рабоце школы ваенна-патрыятычнага выхавання?**

— Асноўная наша мэта — падрыхтоўка арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы для агульнаадукацыйных школ. Я падкрэсліваю, іменна арганізатараў у шырокім разуменні гэтага слова. Слухачы школы — актывісты ваенна-патрыятычнай работы ва універсітэце. Пасля завяршэння вучобы яны атрымліваюць пасведчанні арганізатараў ваенна-патрыятычнага выхавання. Узначальвае школу выкладчык кафедры гісторыі КПСС Уладзімір Ільіч Мядзянік. Планам работы школы прадугледжаны тэарэтычныя і практычныя заняткі.

**— Чым растлумачыць папулярнасць гэтага падраздзялення ФГП на факультэце?**

— Іменна ФГП дапамагае будучым спецыялістам атрымаць не толькі пэўную суму дадатковых навыкаў, але і вучыць перадаваць атрыманыя веды іншым. Таму ў праграме школы прадугледжана шмат практычных заняткаў, уключаны ў яе і пытанні методыкі работы са школьнікамі. Каму ж, як не настаўніку гісторыі, грамадазнаўства, гаварыць з вучнямі аб доўгу, гонары, адвазе. Разумеецца, іменна ў падобнай сітуацыі, у падобных гутарках узнікае нейкая роднасць, сувязь пакаленняў.

**— Раскажыце, калі ласка, якія пазауніверсітэцкія кантакты ўстаноўлены школай?**

— У нас склаліся добрыя адносіны з рэспубліканскай арганізацыяй ДТСААФ. Для чытання лекцый мы запрасілі начальніка Дома ДТСААФ, генерал-маёра Паўла Міронавіча Машэрава. Запланаваны экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Але асабліва дарагія студэнтам сустрэчы з маладымі воінамі, фактычна іх аднагодкамі. Воіны перадаюць студэнтам навыкі ў абыходжанні са зброяй, рацыяй і г. д. Усё гэта будзе замацавана на занятках гурткоў стральбы, радыёспорту. Дарэчы, практычныя заняткі ў гуртку стральбы часткова правядзе чацвёртакурснік Аляксей Вароніч, першаразраднік, грамадскі трэнер. Я думаю, падобнае размеркаванне работы ў гуртку мае вялікі сэнс.

**— Праблемы, задачы і перспектывы развіцця ФГП?**

— Студэнты самі па сабе — самыя камунікабельныя людзі.

## Кантрольная—у тэрмін

Пакойчыкі метадыстаў на першым паверсе геаграфічнага факультэта, дзе размяшчаецца завочны факультэт, — своеасаблівыя пункты сувязі са студэнтамі-завочнікамі на працягу кожнага семестра. Сюды прыходзяць кантрольныя работы студэнтаў, правяраюцца і адсюль адсылаюцца назад аўтарам, каб кожны са студэнтаў меў магчымасць яшчэ да экзаменаў і залікаў выявіць недахопы ў сваіх ведах, нешта ўдакладніць, дапоўніць, перапрацаваць і тым самым лепш падрыхтавацца да сесіі.

Калі студэнт не выканаў усіх кантрольных, выклік на экзамены яму не аплочваецца. Таму большасць студэнтаў выконвае кантрольныя работы ў тэрмін, правільна і акуратна іх афармляе. Але, на жаль, ёсць яшчэ такія, хто з-за сваёй несабранасці не выконвае заданне своечасова, а потым піша заявы аб адтэрміноўцы.

Выкладчыкі, якія правяраюць кантрольныя завочнікаў, абавязаны вярнуць правераныя работы метадыстам у 15-дзённы тэрмін. На жаль, нярэдка яшчэ здараецца, што выкладчыкі нядобрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў, і хаця на завочным факультэце змагаюцца з выпадкамі затрымкі студэнцкіх кантрольных работ, яны час ад часу назіраюцца. Выкладчык гісторыі СССР А. У. Калымага, выкладчык гістарычнага матэрыялізму кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў А. Я. Белы, здараецца, трымаюць на праверцы работы да двух месяцаў. Нясвоечасова вяртаюць работы і выкладчык кафедры беларускай мовы М. І. Сыракваш, і выкладчыца кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Г. І. Ільяшчук. Ім у прыклад хацелася б паставіць тых, хто своечасова выконвае свае абавязкі. Гэта выкладчыкі кафедры эканамічнай геаграфіі СССР Г. А. Смалякоў, выкладчыца кафедры рускай мовы Г. В. Папова, выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання А. І. Цітова.

**А. КОЗЕЛ.**

# ЗІМОВАЯ СЕСІЯ

## ЗАВОЧНАГА

ж аддзялення студэнты — В. Е. Кірэева і Н. С. Каваленка (VI курс), І. Л. Дашко (V курс); А. Б. Нікіцін (III курс аддз. правазнаўства), Н. Я. Магдэнка (III курс) і С. В. Малікаў (II курс) таго ж аддзялення; студэнты аддзялення геаграфіі Т. Н. Трухан і Шуніна (IV курс); Т. І. Юрчык, Л. П. Пятровіч (III курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры); Н. І. Жыхар і Маціеўскі Н. І. (I курс аддз. журналістыкі), М. А. Жыгач і Н. Н. Панкратаў (IV курс таго ж аддз.); Г. В. Кахановіч (IV курс) і І. П. Журавель (V курс) — аддзялення біялогіі і некаторыя іншыя.

Нізкая паспяховасць часткі студэнтаў-завочнікаў — гэта не толькі нядобрасумленнасць са[illegible] студэнтаў, гэта і недапра[illegible]кі дэканата завочнага факультэта і многіх кафедр, якія не змаглі «дайсці» да кожнага студэнта і дапамагчы яму ў вучобе, хаця прафесарска-выкладчыцкі калектыў у цэлым, дэканат завочнага факультэта нямала робяць для паляпшэння індывідуальнай работы са студэнтамі-завочнікамі, узяўшы яе пад строгі кантроль з першага курса. І не выпадкова многія кафедры пры планаванні вучэбных даручэнняў і нагрузкі асаблівую ўвагу ўдзяляюць пытанням падбору і расстаноўкі прафесарска-выкладчыцкіх кадраў для работы на завочным факультэце.

Можна назваць прозвішчы многіх працуючых з завочнікамі вопытных выкладчыкаў, якія валодаюць высокім майстэрствам вучэбна-выхаваўчай работы. Гэта прафесары В. А. Жучкевіч, М. Т. Рамаsucco Раманоўскі, Р. В. Булацкі, Д. Б. Мельцар, В. А. Пыжкоў, А. П. Ігнаценка, Г. М. Ліўшыц, А. Я. Супрун, П. М. Шакун, Б. В. Стральцоў, П. П. Шуба, Л. М. Шнеерсон, А. А. Галаўко, С. Г. Драбязка, І. С. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, А. С. Кляўчэня, А. А. Лойка, С. Х. Александровіч і многія іншыя. Гэта і такія дацэнты, як В. В. Казлова, А. Г. Кляцкоў, А. С. Шуканаў, Е. С. Шалапёнак, Н. Б. Мячкоўская, Е. В. Кічыгіна, Е. В. Петушкова, І. К. Германовіч, В. І. Аўчарэнка, О. М. Галай, І. Д. Стадуб, І. А. Юхо, В. П. Красней, Л. Л. Кароткая, А. І. Кастроў, П. І. Ткачоў, Б. П. Міцкевіч і многія іншыя.

На працягу навучальнага года не менш двух разоў у семестр кафедры сумесна з дэканатам завочнага факультэта абмяркоўвалі пытанні арганізацыі навучальнага працэсу на завочным факультэце, пытанні аказання максімальнай дапамогі студэнтам у міжсесійны перыяд, пытанні ўдасканалення індывідуальнай работы студэнтаў-завочнікаў. Арганізавана праводзіліся дні завочніка, кансультацыі (індывідуальныя і групавыя), праводзіліся заняткі з групамі студэнтаў-мінчан і тых, хто жыве ў прыгарадзе, пры магчымасці завочнікі падключаліся да лабараторных заняткаў студэнтаў вячэрняга аддзялення (біёлагі, мовазнаўцы і інш.). Нядрэнных паказчыкаў дабіліся асобныя кафедры і ў навукова-даследчай рабоце студэнтаў-завочнікаў, нягледзячы на складаныя ўмовы вядзення гэтай работы (абмежаваны бюджэт часу і немагчымасць пастаянна і непасрэдна зносіцца з навуковым кіраўніком). Да ліку такіх належыць аднесці кафедру гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, гісторыі, філасофіі і логікі, марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, кафедру дзяржаўнага права і будаўніцтва, кафедру старажытнага свету і сярэдніх вякоў, многія кафедры біялагічнага і геаграфічнага аддзяленняў.

Так, напрыклад, на агульнауніверсітэцкай навуковай студэнцкай канферэнцыі выступіла 20 студэнтаў-завочнікаў з дакладамі, падрыхтаванымі на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, 9 чалавек — з дакладамі, падрыхтаванымі на кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва і інш.

На жаль, у гэтым плане адстаюць кафедры філалагічнага профілю, журналістыкі, правазнаўства, педагогікі, не выкарыстоўваюцца ў патрэбнай меры тыя абставіны, што многія студэнты гэтых аддзяленняў сумяшчаюць вучобу з практычнай дзейнасцю па выбранай спецыяльнасці.

Нельга не адзначыць недалікі і ў нашай выхаваўчай рабоце, бо прыходзіцца сутыкацца і з нізкім узроўнем культуры паводзін студэнта-завочніка, і з фактамі дрэнных паводзін у інтэрнаце і на занятках, у бібліятэцы і чытальных залах. Нярэдка студэнты-завочнікі не могуць аформіць патрэбным чынам дакументацыю, правільна напісаць заяву, а характар пісем, якія дасылаюцца ў дэканат, сведчыць часам аб элементарнай малаадукаванасці.

Частка выкладчыкаў, на жаль, бачыць сваю задачу ў рабоце з завочнікамі толькі ў чытанні лекцый або правядзенні практычных заняткаў, забываючыся на тое, што для студэнтаў-завочнікаў у адрозненне ад студэнтаў стацыянара і вячэрняга аддзялення, дзе існуе сістэма куратарства, выкладчык, які прыйшоў у аўдыторыю, не толькі лектар, але і педагог у самым высокім разуменні гэтага слова, выхавацель і ўзор паводзін. Таму выхаваўчая работа — гэта адна з састаўных частак нашай агульнай працы ў барацьбе за павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, а якасць гэта яшчэ адстае ад патрабаванняў часу і ў плане выхавання і ў плане навучання.

Пры агульным росце паспяховасці дамініруючай адзнакай на завочным факультэце застаецца «здавальняюча».

З гэтым таксама нельга мірыцца, бо сёння, калі на вытворчасці патрабаванні да маладога спецыяліста значна ўзраслі, «тройка» ў заліковай кніжцы завочніка — сведчанне нізкай якасці яго падрыхтоўкі, а разам з тым і характарыстыка якасці нашай сумеснай работы.

**Н. МАЖЭЙКА,**
**дэкан завочнага факультэта.**

## ХУТКА АПОШНІ ЗВАНОК

Як непрыкметна праляцеў час вучобы ва універсітэце. Шэсць год? І многа, і мала. Здаецца, зусім нядаўна мы прыйшлі ў вялікія светлыя аудыторыі. У наш век НТР патрэбны глыбокія, усебаковыя веды. Таму і прыйшлі мы сюды.

Нас у 4-й групе VI курса гістфака 33 чалавекі. Людзі розныя па ўзросту і па прафесіях. Многія са студэнтаў—настаўнікі, некаторыя працуюць на заводах, служаць у радах Савецкай Арміі. Усіх нас аб'яднала любоў да гісторыі. Яшчэ нямнога намаганняў, і мы атрымаем дыпломы.

Чаго грахі таіць, усяго было за 6 год вучобы: і бяссонныя ночы, і неадступныя дрыжыкі пад дзвярыма ў час здачы залікаў і экзаменаў... Група спачатку была нядружная. Склалася яна ў асноўным на II курсе.

Першай нашай цяжкасцю была дрэнная наведваемасць. Мне як старасце прыйшлося прыкласці нямала намаганняў, каб згуртаваць калектыў, весці барацьбу з прагульшчыкамі і адстаючымі. Усё ўжо ў мінулым. Зараз наша група самая дружная. Мы дапамагаем адзін аднаму ў вучобе. Калі які-небудзь прадмет даецца з цяжкасцю, мы практыкуем перад экзаменам сумесны разбор усіх пытанняў. І гэта дае добрыя вынікі.

Сярод лепшых студэнтаў групы можна адзначыць Алену Кароза. Яна працуе настаўніцай у школе-інтэрнаце г. п. Зельва Гродзенскай вобласці. Вельмі здольная і працалюбівая, як гаворыцца, усё хапае «на ляту». Яна — маці 4-гадовай Марынкі. Цяжка сумяшчаць работу ў школе з вучобай у ВНУ, быць добрай жонкай і маці, але ў Лены можна павучыцца арганізаванасці. Сістэматычна наведваюць лекцыі, паспяхова выступаюць на практычных занятках студэнты А. Волахава, Н. Рамульт, А. Саласін, Т. Светачэўская, А. Туромша, Ж. Хачырашвілі, Н. Уліцкая.

Разам з тым яшчэ не ўдаецца цалкам пазбавіцца ад парушэнняў дысцыпліны. З-за нерэгулярнай наведваемасці некалькі чалавек маюць запазычанасці, а ў час здачы экзаменаў усё-такі нейк умудраюцца «спіхнуць» чарговы прадмет. Але такіх у нас — адзінкі.

Мы, шасцікурснікі, выказваем вялікую ўдзячнасць усім нашым выкладчыкам за іх высокакваліфікаваныя лекцыі, за дадзеныя нам добрыя веды. Дзякуем выкладчыкам за іх працу, цярплівасць.

І сёння кожнаму з нас сумна думаць, што так хутка трэба будзе развітвацца з універсітэтам...

**Т. ХРУЦКАЯ,**
**стараста 4-й групы VI курса аддзялення гісторыі завочнага факультэта.**

Імкненне да ўдзелу ў грамадскім жыцці — натуральнае імкненне амаль кожнага з іх. [illegible] для нас, кіраўнікоў, вельмі [illegible]кна ўмець своечасова разгледзець у студэнце рысы грамадскага актывіста, кіраўніка. Прыцягнуць яго да ФГП, стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для развіцця асобы актывіста — наша задача.

Думаю, не трэба яшчэ раз упамінаць аб адказнасці за якасць работы школы ваенна-патрыятычнага выхавання. ФГП у гэтых адносінах робіць вялікую і высакародную справу.

На жаль, у БДУ існуе толькі факультэт грамадскіх прафесій. А ў многіх ВНУ краіны ўжо працуюць цэлыя універсітэты грамадскіх прафесій. Напрыклад, у Казахскім педінстытуце імя Абая дзейнічае універсітэт грамадскіх прафесій, дзе выкладанне вядзецца на факультэтах, у тым ліку і на факультэце ваенна-патрыятычнага выхавання.

**Запісала І. ТОЎСЦІК.**



Трэцякурснікі геафака ў час практыкі на геастанцыі «Заходняя Беразіна» вывучаюць глебы.

## Удасканальваць педагагічную практыку

ГІСТАРЫЧНЫЯ рашэнні XXV з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай і сярэдняй школе паставілі вялікія задачы па далейшаму ўдасканаленню ўсёй сістэмы народнай адукацыі ў краіне, у першую чаргу паляпшэння якасці падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў.

Усё ўзрастаючую ролю ў падрыхтоўцы народных настаўнікаў адыгрываюць універсітэты краіны.

Асаблівае значэнне ў рашэнні задачы належыць БДУ — флагману вышэйшай школы рэспублікі. На сямі факультэтах нашага універсітэта вядзецца падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў.

Арганізацыя і правядзенне педагагічнай практыкі — важнейшае звяно ўсёй сістэмы падрыхтоўкі народных настаўнікаў. У нашым універсітэце назапашаны вялікі станоўчы вопыт правядзення і ўдасканалення педагагічнай практыкі студэнтаў.

Аналіз работы факультэтаў універсітэта паказвае, што нашы выпускнікі маюць больш высокі ўзровень агульнатэарэтычнай і спецыяльнай падрыхтоўкі ў параўнанні з настаўнікамі, якія скончылі педагагічныя інстытуты. Гэта натуральна. Аднак нашы выпускнікі маюць больш нізкі ўзровень метадычнай падрыхтоўкі, чым настаўнікі — выпускнікі педагагічных інстытутаў. Асабліва гэта адмоўна адбіваецца ў першыя гады работы маладых настаўнікаў.

Як паказвае педагагічная практыка, нашы студэнты часта не ведаюць, як выклікаць у вучняў інтарэс да вучэння і актывізаваць іх пазнавальную дзейнасць, як аб'яднаць вучэбныя і выхаваўчыя задачы на ўроку, як падтрымаць дысцыпліну ў класе, і многае іншае.

У вучэбны працэс усё шырэй укараняюцца тэхнічныя сродкі навучання, такія, як кінапраектары, эпідыяскопы, дыяпраектары, магнітафоны, тэлебачанне, навучаючыя машыны. Нашы выпускнікі, як правіла, не ўмеюць прымяняць тэхнічныя сродкі навучання. Іх трэба навучыць гэтаму. Неабходна прадугледзець адпаведныя спецкурсы і спецсемінары. Асабліва відавочныя і недапушчальныя недахопы ў падрыхтоўцы студэнтаў да правядзення выхаваўчай работы з вучнямі.

У студзені 1979 года кафедры педагогікі і псіхалогіі, навукова-метадычны савет і універсітэцкае аддзяленне педагагічнага таварыства правялі агульнауніверсітэцкую навукова-метадычную канферэнцыю, прысвечаную праблемам педагагічнай практыкі студэнтаў.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел, акрамя выкладчыкаў кафедр педагогікі і псіхалогіі, прадстаўнікі рэктарата, дэканатаў, метадысты, кіраўнікі школ і настаўнікі. Канферэнцыю ўступным словам адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар У. Р. Івашын.

Адбыўся таксама абмен думкамі і вопытам работы па правядзенню педагагічнай практыкі студэнтаў.

Удзельнікі навукова-метадычнай канферэнцыі вызначылі шляхі далейшага ўдасканальвання педагагічнай практыкі студэнтаў. Даклады і выступленні будуць апублікаваны асобным зборнікам.

**В. МЕШЧАРАКОЎ,**
**дацэнт кафедры педагогікі.**

Знаёмцеся: нашы сябры

# ЯК АДЗНАЧАЮЦЬ НОВЫ ГОД У В'ЕТНАМЕ

В'ЕТНАМСКІ народ адзначае Новы год па Лунному календару вясной. Таму ў час навагодняга свята ў нас вельмі многа кветак. Замежных турыстаў заўсёды захапляе вялікі кветкавы кірмаш, які размяшчаецца на адной з вуліц Ханоя. Тут можна сустрэць такія кветкі, якіх няма ні ў адным іншым месцы зямнога шара. Калі для еўрапейца сімвалам Новага года з'яўляецца ёлка, то для нас — персікавае дрэва з пяціканцовымі чырвонымі кветкамі. Чаму так? У нас існуе такая легенда.

... Даўным-даўно ў В'етнаме жыла прыгажуня-майстрыца, якая ткала цудоўны шоўк. Яна хацела выйсці замуж толькі за чалавека, які зможа ўмела вырабіць такую ж тканіну. У адной вёсцы знайшоўся такі хлопец. Яго тканіна вызначалася асаблівай прыгажосцю і арыгінальнасцю. Для атрымання тканіны з пяціканцовымі чырвонымі кветкамі ён узяў кроў са сваіх дзесяці пальцаў. Дзяўчына пайшла замуж за гэтага хлопца, але іх саюз не спадабаўся жорсткаму каралю. Ён загадаў арыштаваць хлопца, а дзяўчыну сам забраў у жонкі. Абураны хлопец падпаліў каралеўскі палац і сам ператварыўся ў персікавае дрэва, а дзяўчына — у чырвоныя кветкі на яго галінах. І з тае пары яны заўсёды разам, калі наступае вясна...

Вось чаму ў нас лічаць персікавае дрэва сімвалам вечнага кахання, сімвалам росквіту, сімвалам Новага года. Кожны наступаючы год мае сваё імя. Гэты год будзе годам аўцы, а мінулы год быў годам каня. Па паданню, лёс кожнага чалавека залежыць ад таго, у якім годзе ён нарадзіўся. Напрыклад, я нарадзіўся ў 1954 годзе (годзе каня), значыць, маё жыццё будзе вельмі цяжкім (конь павінен працаваць усё жыццё). В'етнамцы вельмі старанна рыхтуюцца да Новага года. Перш за ўсё трэба набыць асаблівы сорт клейкага рысу, зялёны гарох, свініну і чорны перац для вырабу святочных пірагоў Бань Чынг, якія маюць форму прамавугольнай каробкі і аплецены вялікім зялёным лісцем дрэва Зонг. Такія пірагі з'яўляюцца сімвалам багатай зямлі, якая дае людзям рыс і мяса. Яны вельмі пажыўныя і доўга захоўваюцца, таму в'етнамскія салдаты амаль усіх часоў бралі іх з сабой у паходы.

Раніцай першага дня Новага года на вуліцах не бачна ніводнай душы. Лічыцца, што тым, хто выйдзе рана на вуліцу, не павязе ў Новым годзе. Людзі выходзяць з дому, толькі калі сонца стане ярка свяціць. Тады пачынаюць прыходзіць у госці, віншаваць адзін аднаго. Свята адзначаюць цэлы тыдзень. Трэцяга дня ўсе абавязкова збіраюцца ля ўзвышша Донг Да, каб адзначыць дзень перамогі в'етнамскага народа над кітайскімі агрэсарамі (у 1789 годзе вялікі в'етнамскі палкаводзец Нгуен Хе ў час Новага года за некалькі дзён разграміў амаль паўмільённую армію кітайскай дынастыі Цыня). Тут можна любавацца танцамі драконаў (драконы—сімвал сілы і горада Ханоя), шэсцем салдат у адзенні эпохі Нгуен Хе.

Спадзяюся, што мне ўдалося ў асноўных рысах пазнаёміць савецкіх студэнтаў з адным з бакоў жыцця в'етнамскага народа.

**ТО ТУАН,**
**аспірант.**





26 студзеня індыйскі народ адзначае 29-ю гадавіну з дня абвяшчэння рэспублікі. Савецкія людзі выказваюць глыбокую сімпатыю і павагу да дружалюбнага індыйскага народа, які стварыў унікальныя шэдэўры дойлідства, манументальнага жывапісу, музыкі, літаратуры, прыкладнога мастацтва. Народ Індыі, які вынес на сваіх плячах амаль двухвекавое панаванне англійскага капіталу, захаваў сваю нацыянальную культуру, звычаі, непаўторны нацыянальны каларыт. І, горды за сваё выдатнае мінулае, хвалюючыся за трывожнае і супярэчлівае сёння, ён з надзеяй глядзіць у будучыню, шлях да якой пракладваюць сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, далейшае развіццё эканомікі, навукі, сістэмы адукацыі.

На здымках: 80-метровы Кутуб-мінар быў пабудаван у 1199 годзе; «заклінацель» змей на адной з вуліц Дэлі.

Фота **У. Будая.**

На конкурс

# ГУЧАЦЬ РАДКІ ВЕРШАЎ...

Зімовы вечар наступае даволі хутка. Мацнее мароз, ружовіць твары сустрэчных. Загараецца агнямі вячэрні Мінск.

У праўленні універсітэцкага клуба мастацкай самадзейнасці збіраюцца адзін за другім студэнты, прыносячы з сабой ва ўтульны пакойчык подых марозу і снегу. Становіцца весела і шумна. Рома Кветнер з Сярожам Мацкевічам іграюць на піяніна ў чатыры рукі, Таня Копіна дзеліцца новай ідэяй, Тома Прахарэнка размаўляе аб нечым сур'ёзным з Дзінай Георгіеўнай Тыцюк, кіраўніком клуба.

Вось і ўсе ў зборы. Дружны натоўп рухаецца ў аўдыторыю, дзе і пачынаюцца заняткі студыі мастацкага слова. Спачатку тэхніка адпрацоўкі голасу. Практыкаванні выконваюцца жыва, весела. Ні для каго гэта не сумна.

— Дзіна Георгіеўна, а мы даўно ўжо эцюдаў не ставілі.

— Ну, добра. Паспрабуем. Таня, Сярожа, Тома, набірайце сабе групы.

Работа закіпела. Пасля бурных рэпетыцый свае эцюды паказваюць «тэатральныя» групы. Вось раніца ў піянерскім лагеры. Яе змяняе вясёлы Новы год у адной з воінскіх часцей. Заканчвае праграму інсцэніроўка «Лебядзінай песні». А потым спрэчкі, у каго лепш атрымалася.

Нарэшце Дзіна Георгіеўна абвяшчае:

— Ну, хопіць на сёння. Хто першы на пляцоўку?

Гучаць радкі вершаў... Мы ў незвычайным свеце паэзіі. Вялікім і непаўторным.

— Ларыса, пачакай! Паспрабуй увайсці ў сэнс гэтых радкоў...

«Ведь если звезды
зажигают —
значит, это кому-нибудь
нужно?
Значит, кто-то хочет, чтобы
они были...»

— Удумайся, Ларыса, уяві, што вечаровае неба пустыннае і цёмнае. Але камусьці яны патрэбны, хтосьці задыхаецца без іх. Разумееш? Ну, давай яшчэ раз.

...І зноў гучаць радкі. Ужо ў каторы раз.

Не адразу прыходзіць разуменне і адчуванне вершаванага радка. Патрэбен час, патрэбна работа над радком, над сабой, каб навучыцца чытаць творча, пранікнёна, каб слухача ўсхваляваў радок паэта. А гэта прыходзіць не за дзень, не за два.

Паэзія дапамагае зразумець чалавека, знайсці сяброў, а галоўнае, — аднадумцаў. Гэта адчулі на сабе члены студыі. Сабраліся яны, такія розныя, з розных факультэтаў універсітэта, аб'яднаныя любоўю да паэзіі.

Тома Прахарэнка і Сярожа Мацкевіч—з факультэта радыёфізікі, Рома Кветнер — з мехмата. З іх пачыналася студыя два гады назад. За імі прыйшлі іншыя. Прыйшлі і прыходзяць, таму што знаходзяць тут тое духоўнае ўзаемаўзбагачэнне, якога часам так не хапае чалавеку.

І няхай спачатку крокі ў свет паэзіі будуць няўпэўненымі. Гэта нічога. Усё прыйдзе з часам.

**М. ЛАХВІЧ.**

## Юрыдычная кансультацыя

**ЦІ ЗАХОЎВАЕЦЦА ПЛОШЧА ЗА АСОБАМІ, ЯКІЯ АДСУТНІЧАЮЦЬ ПА ЎМОВАХ РАБОТЫ АБО Ў СУВЯЗІ З НАВУЧАННЕМ!**

**Жылая плошча захоўваецца ў выпадках часовага жыхарства па ўмовах і характару работы (экіпажы судоў, работнікі геалагічных, разведвальных партый і г. д.) альбо ў сувязі з навучаннем (студэнты, аспіранты і г. д.) на працягу ўсяго часу выканання данай работы ці навучання. Па практыцы, якая ўстанавілася, указаныя асобы для захавання права на плошчу абавязаны двойчы ў год прадстаўляць наймадацелю адпаведныя даведкі з месца работы або навучання.**

**Паколькі за асобамі, якія адсутнічаюць па ўмовах работы ці ў сувязі з навучаннем, захоўваецца права на плошчу ў месцы іх пастаяннага жыхарства, указаныя асобы не набываюць самастойнага права на плошчу, на якой яны пражываюць у перыяд работы ці навучання.**

**Па заканчэнні работы ці навучання грамадзянін ў адпаведнасці з агульным правілам мае права на жылую плошчу на працягу шасці месяцаў. Калі, аднак, па заканчэнні работы ці навучання грамадзянін выехаў на пастаяннае жыхарства ў іншае месца, ён губляе права на раней замацаваную за ім плошчу з моманту выезду.**

# ВЫХОЎВАЦЬ ЧАЛАВЕКА

Бібліятэка БДУ распрацавала і правяла дыспут на тэму «Настаўнік — гэта прэстыжна, цяжка, адказна» на другім курсе механіка-матэматычнага факультэта. Перад дыспутам другакурснікі правялі на педпатоку анкетнае апытванне аб будучай прафесіі. Залу ўпрыгожылі плакатамі, партрэтамі выдатных педагогаў — Н. К. Крупскай, А. С. Макаранкі, К. Д. Ушынскага. Вядучы дыспуту — дацэнт кафедры педагогікі, кандыдат педагагічных навук М. А. Белавусаў.

— Ёсць прафесія,—пачынае ён размову, — якую можна назваць маці прафесій. Гэта прафесія настаўніка. Быць настаўнікам ганарова і цяжка.

Далей вядучы гаварыў аб тым, што словы У. І. Леніна аб месцы і ролі настаўніка ў грамадстве знаходзяць пацвярджэнне ў нашым жыцці. У нашай краіне праароблена каласальная работа па падрыхтоўцы настаўнікаў. У ліпені 1978 года прайшоў чарговы з'езд настаўнікаў. Настаўніцтва абмяркоўвала праблемы савецкай школы на сучасным этапе, перспектывы далейшага развіцця усёй сістэмы народнай адукацыі ў святле задач, якія паставіў XXV з'езд КПСС.

Удзельнікі дыспуту гаварылі аб меры адказнасці настаўніка перад будучым, аб тым, якімі якасцямі павінен валодаць настаўнік, што трэба зрабіць сёння для здзяйснення сваёй мары.

— Настаўнік першым адкрывае дарогу ведаў,—лічыць Ніна Галоўчыц.— Праца настаўніка складаная і шматгранная. Галоўнае ў нашай будучай прафесіі — гэта любоў да дзяцей.

Яе думку прадоўжыў Іван Млечка:

— Настаўнік павінен любіць дзяцей, выхоўваць чалавека. І калі сам настаўнік не будзе валодаць такімі якасцямі, як сумленнасць, праўдзівасць, дабрата, то ён не зможа выхаваць гэтыя якасці ў сваіх вучняў.

Лена Матаранка расказвае аб сваёй любімай настаўніцы, чалавеку з вялікай унутранай культурай, душэўным багаццем, высокай эрудыцыяй, рознабаковымі ведамі, аптымізмам.

— Настаўніцай вырашыла стаць даўно, з першага класа,— сказала Валя Качан.—Падабалася гэта высакародная праца. Адчувала, што педагог з мяне атрымаецца. Буду выкладчыцай матэматыкі, бо лічу, што матэматыка — самы цяжкі прадмет.

Далей удзельнікі дыспуту гаварылі аб адносінах настаўніка і вучня. Аляксей Кудласевіч пераканан, што настаўнік павінен быць старэйшым таварышам для сваіх вучняў. Сяброўскія адносіны з вучнямі ў многім залежаць ад самога настаўніка. Узаемаразуменне і дружба — вось што павінна вызначаць адносіны настаўніка і вучня.

Кожны выказвае свае думкі. Некаторыя лічаць, што можа ўзнікнуць псіхалагічны бар'ер паміж настаўнікам і вучнямі, але ўсе разам прыходзяць да вываду, што гэтага не павінна быць.

Галя Каляда ўзнімае пытанне аб аб'ектыўнасці настаўніка. Трэба аб'ектыўна ставіць адзнакі — інакш падае цікавасць да прадмета. Адзнака— не сродак пакарання. Сапраўдны настаўнік ніколі не прыніціць вучня несправядлівасцю.

Шмат гавораць і аб тым, якім будзе настаўнік будучыні. Затым вядучы пераводзіць размову на знешні воблік настаўніка. Лена Хейфіц выказвае сваю думку аб гэтым. Далей размова пераходзіць да грамадскай работы ў жыцці настаўніка. Лена Аўласевіч упэўнена, што грамадская работа вельмі важная ў паўсядзённым жыцці, дапамагае знайсці свой рытм жыцця, спатрэбіцца ў будучай рабоце настаўніка.

Госць другакурснікаў, старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ І. М. Марозаў, падводзячы вынікі дыскусіі, адзначыў, што ва ўсе часы і ва ўсіх народаў прафесія настаўніка была самай ганаровай. Кожнаму студэнту з малодшых курсаў патрэбна, усведамляючы значнасць прафесіі настаўніка, фарміраваць свае марксісцка-ленінскія перакананні.

**Н. КАВЕРЫНСКАЯ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 155 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 08545